Дзяржава для народа
# Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
25 студзеня 2017 г.
№ 2 (386)




стар. 2

**Навацыі заканатворцаў для аўтамабільных перавозчыкаў**



стар. 7

**Некаторыя думаюць, што дэпутатам «плацяць»**



стар. 8

**Сельская ідылія на новы лад**

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

# ПАЦЯПЛЕННЕ ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА КЛІМАТУ

## Пяць прадпрыемстваў за адзін дзень — Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пачаў сваю работу




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Працавацъ на «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» прэстыжна. Не дзіва, што вакансіі тут бываюць рэдка.

**Першае ў гэтым годзе выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі прайшло ў Лідскім раёне. Там члены Савета і госці паглядзелі, як прыцягваюцца замежныя інвестыцыі, і абмеркавалі работу органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Асноўны крытэрый — выкананне задач, агучаных на V Усебеларускім сходзе.**

### Спачатку — экскурсія

Першы прыпынак — шклозавод «Нёман». Прадпрыемства, якое робіць адны з самых прыгожых вырабаў са шкла. Дарэчы, у той дзень увечары, пасля візіту Савета па ўзаемадзеянні, «нёманскае» шкляное сэрца ўручылі пераможцам Нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне». На вытворчасці не так даўно прайшла мадэрнізацыя — пра яе расказаў дырэктар «Нёмана» Ігар Бацян. Акрамя гэтага, на заводзе імкнуцца паступова зніжаць сабекошт. Эканамічны эфект ад такіх мерапрыемстваў у 2015 годзе склаў 1,6 млн рублёў, у 2016-м — 1,2 млн рублёў. Калі зайшла размова пра заробак, дырэктар адзначыў, што ўзровень у 1000 рублёў можа быць дасягнуты ў бліжэйшы час. «Асаблівасць на вытворчасці шклаваты зрабіць гэта — элементарна».

стар. 4

СІТУАЦЫЯ

# ЦАНА ПЫТАННЯ — 64 КАПЕЙКІ

## Як плаціць за вываз смецця вяскоўцам

**Вольга Шабіцкая жыве ў вёсцы Вялікая Быхаўшчына Нясвіжскага раёна ў прыватным доме, мае прысядзібны ўчастак у 5 сотак. Вользе Канстанцінаўне 77 гадоў. Яна інвалід II групы. Нясвіжская жыллёва-камунальная гаспадарка (ЖКГ) прапанавала ёй заключыць дамову на вываз цвёрдых бытавых адходаў, але жанчына адмовілася. Як сцвярджае сама, у яе «практычна няма смецця». Яе выклікалі ў суд: камунальнікі падалі іскавую заяву. І цяпер ёй трэба заплаціць тры базавыя велічыні дзяржпошліны. На судовае пасяджэнне у Нясвіж яна прыехаць не можа, паколькі перанесла інсульт. А аўтобус, паводле слоў Вольгі Канстанцінаўны, ходзіць з райцэнтра ў вёску толькі раз на тыдзень. І тады яна звярнулася па дапамогу ў «Мясцовае самакіраванне». На чыім баку праўда, разбіраўся наш карэспандэнт.**

стар. 3

СВЯТЛО Ў АКНЕ

# ТРЭБА ПРОСТА ЛЮБІЦЬ...

## Цяпло і клопат адчуюць маленькія насельнікі двух новых дамоў сямейнага тыпу, што адкрыліся на Гомельшчыне



Прыёмныя дзеці Арсеній, Ліза, Аня і Андрэй з Наталляй АГАФОНАВАЙ.

**Цяпер у Гомельскай вобласці стала 43 дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Амаль 300 дзяцей-сірот і дзяцей, пакінутых без апекі бацькоў, выхоўваюцца ў гэтых установах.**
**Дарэчы, 10 гадоў таму такіх дамоў было толькі тры. Два новыя ўрачыста адкрылі напярэдадні новага года: у Чачэрску і Ветцы.**

Юныя жыхары будынка, які стаіць у самым цэнтры Веткі, за царквой, абжываюць свае пакойчыкі, расстаўляюць цацкі па паліцах, а гаспадыня Наталля Агафонава вітае гасцей гарбатай з цукеркамі.

Самы малодшы з пяці дзетак, трохгадовы Арсеній, уцеца хвосцікам і радасна вітае кожнага, хто ўваходзіць. Родная маці адмовілася ад яго пры нараджэнні. Тут ён упершыню звездаў цеплыню абдымкаў і слова «мама» вымаўляе з абсалютнай упэўненасцю.

стар. 6